37.011




Э. Р. ІОФЕ

# ВЫХОЎВАЦЬ ПАВАГУ ДА ЗАКОНА

Э. Р. ЮФЕ

# ВЫХОЎВАЦЬ ПАВАГУ ДА ЗАКОНА

МІНСК «НАРОДНАЯ АСВЕТА» 1978

371.011
І 75
УДК 371.4 : 34(47+57)

ЫБЛІСТЕК 862954

**Іофе Э. Р.**

І 75 Выхоўваць павагу да закона.— Мн.: Нар. асвета, 1978.— 120 с.

У кнізе абагульнены вопыт работы настаўнікаў рэспублікі па стварэнню адзінай сістэмы прававога выхавання ў школе, паказаны асноўныя формы і метады фарміравання ў вучняў павагі да сацыялістычнага права і савецкіх законаў як на ўроках, так і працэсе пазакласнай работы.

На базе факультатыва «Асновы савецкага заканадаўства», які аўтар доўгі час вёў у розных школах г. Мінска, вопыт прававога выхавання вучняў прайшоў эксперыментальную праверку лабараторыі навучання грамадазнаўству Інстытута зместу і метадаў навучання Акадэміі педагагічных навук СССР.

І $\frac{60602-092}{М 303(05)-78}$ 127—78 371.011

© Выдавецтва «Народная асвета», 1978.

## УВОДЗІНЫ

Фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы, выхаванне ва ўсіх савецкіх людзей, асабліва моладзі, пачуцця высокай грамадзянскай адказнасці за агульную справу будаўніцтва камунізма — адна з галоўных задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС і замацаваных у новай Канстытуцыі СССР. Чым вышэй камуністычная перакананасць членаў грамадства, іх дысцыпліна і арганізаванасць, правасвядомасць і пачуццё грамадзянскага абавязку, тым паўней і шырэй разгортваецца іх творчая ініцыятыва, хутчэй складваюцца камуністычныя формы працы і адносіны паміж людзьмі.

Важнейшым стымулам у развіцці грамадска-палітычнай актыўнасці людзей і стварэнні надзейнага прававога фундамента развітога сацыялізма з'яўляецца прававое выхаванне, і перш за ўсё выхаванне павагі да права, да савецкіх законаў.

Сапраўдная павага да закона! Вакол гэтага яснага і ў той жа час складанага пытання ідзе цяпер сур'ёзная

размова па радыё і тэлебачанні. Мы памятаем ленінскія запаветы аб значэнні сацыялістычнай законнасці і прававым выхаванні працоўных. Аб тым, што павага да права, да савецкіх законаў павінна стаць асабістым перакананнем кожнага савецкага чалавека, адзначалася на XXIV з'ездзе партыі. Прынятыя Вярхоўным Саветам СССР «Асновы заканадаўства СССР і саюзных рэспублік аб народнай адукацыі» таксама разглядаюць выхаванне дзяцей і моладзі ў духу павагі да савецкіх законаў і сацыялістычнага правапарадку як адну з неабходных задач народнай адукацыі і ўсёй вучэбна-выхаваўчай работы ў школе. Нарэшце, успомнім пранікнёныя словы выдатнага савецкага педагога В. А. Сухамлінскага: «Паважай законы Савецкай дзяржавы. Закон — гэта канцэнтрацыя шматвяковай мудрасці і шматвяковага дабра. Закон абараняе і ахоўвае перш за ўсё цябе, тваю сям'ю, тваё шчасце, будучае тваіх дзяцей».

Неабходнасць узмацнення прававога выхавання, фарміравання павагі да закона на сучасным этапе абумоўлена і тым, што па меры руху нашага грамадства да камунізма ўсё больш нецярпімымі становяцца адхіленні ад сацыялістычных норм маралі, якія яшчэ сустракаюцца ў нас: хцівасць, прыватнаўласніцкія тэндэнцыі, бюракратызм, абыякавасць да чалавека і г. д. У барацьбе з такімі з'явамі, не ўласцівымі самой сутнасці сацыялізма, неабходна, як указаў XXV з'езд КПСС, выкарыстоўваць усе сродкі: думку працоўнага калектыву, крытычнае слова друку, метад пераканання і, нарэшце, сілу закона.

Нельга не адзначыць у сувязі з гэтым, што далёка не ўсе грамадзяне, асабліва маладыя людзі, цвёрда ведаюць і няўхільна захоўваюць прававыя нормы і правілы сацыялістычнага супольнага жыцця, не заўсёды выразна ўяўляюць сабе аб'ём сваіх правоў і абавязкаў, а таксама вынікі невыканання законаў для сябе і для грамадства. Некаторыя школьнікі, напрыклад, памылкова думаюць, быццам малады ўзрост або няведанне закона вызваляе іх

ад адказнасці за правапарушэнні. Адна з прычын гэтага — нізкая прававая культура, недастатковасць прававых ведаў. Таму прававое выхаванне падрастаючага пакалення, і ў першую чаргу моладзі,— прадмет асаблівых клопатаў партыі і дзяржавы. Павага да закона, норм і правіл нашага грамадства фарміруюцца ў чалавеку з дзяцінства. Цяжка пераацаніць тут ролю школы і сям'і.

Важнейшая мэта прававога выхавання ў школе — фарміраванне правасвядомасці і грамадзянскай адказнасці вучняў. Гэта азначае: а) разуменне савецкіх законаў, правоў і абавязкаў савецкіх грамадзян, павага да законаў, норм і правіл сацыялістычнага ладу жыцця і строгае іх выкананне, павага да органаў і асоб, якія ахоўваюць парадак у грамадстве; б) імкненне да засваення прававых ведаў; в) патрэбнасць выконваць «Правілы для вучняў», ахоўваць правапарадак у мікрараёне школы, у вёсцы, пасёлку, горадзе; г) усведамленне грамадзянскай адказнасці за зробленыя ўчынкі і правапарушэнні; д) адмоўныя адносіны да праяў беззаконнасці і правапарушэння. У выніку кожны вучань павінен засвоіць асноўныя прынцыпы і гуманістычную накіраванасць савецкага сацыялістычнага права, выпрацаваць правільную прававую арыентацыю, набыць не толькі веды асноў заканадаўства, але выхаваць у сябе глыбокую павагу да сацыялістычнага права, якая ператвараецца ў асабістае перакананне, у штодзённую прывычку выконваць законы і прававыя патрабаванні грамадства.

Павышэнне прававой культуры школьнікаў і фарміраванне ў іх павагі да права і савецкіх законаў немагчымы без стварэння ў школе адзінай строгай сістэмы прававога выхавання ў цэлым. На жаль, такая сістэма ў школах знаходзіцца яшчэ ў стадыі станаўлення. Часам прававое выхаванне разумеецца вельмі вузка і зводзіцца да асобных разрозненых мерапрыемстваў, не звязаных з усім комплексам маральнага і ідэйна-палітычнага выха-

вання вучняў. Прычым сама прававая прапаганда праводзіцца часта ў адрыве ад грамадска карыснай работы вучняў, не суправаджаецца іх грамадскай актыўнасцю. Часам не ўлічваюцца ўзроставыя і псіхалагічныя асаблівасці школьнікаў, пры тлумачэнні правоў і абавязкаў аднабакова падкрэсліваюцца толькі правы моладзі, а ўпускаюцца з-пад увагі іх абавязкі.

Як і ўсякая іншая выхаваўчая сістэма, прававое выхаванне павінна ўключаць у сабе: а) цесную ўзаемасувязь усіх звенняў, форм і метадаў, у першую чаргу прававой адукацыі і выхавання вучняў пры вывучэнні асноў навук з рознымі формамі пазакласнан і пазашкольнай работы; б) улік узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў і спецыфікі вучэбных прадметаў; в) пераемнасць, паслядоўнасць прававога выхавання з I па X клас; г) умелую і своечасовую каардынацыю ўсёй работы сям'і, школы, грамадскіх і дзяржаўных арганізацый, у тым ліку і домакіраўніцтваў, па прававому выхаванню.

Каб асобныя пункты, звенні гэтай сістэмы звязаць у адзіны комплекс, напомнім, якія элементы ўваходзяць у змест прававога выхавання ў школе:

1. Вывучэнне сістэмы савецкага заканадаўства (па галінах права).

2. Раскрыццё непарыўнай сувязі савецкага заканадаўства з сістэмай сацыялістычных грамадскіх адносін.

3. Сістэматычнае раскрыццё палажэння аб тым, што ў законе ў сканцэнтраваным выглядзе выражана воля ўсяго савецкага народа.

4. Пастаяннае проціпастаўленне савецкага права праву буржуазнаму з мэтай пераканання вучняў у самым дэмакратычным характары прынцыпаў сацыялістычнага права.

5. Паказ шкоды, якую наносяць грамадству нават нязначныя правапарушэнні, раскрыццё грамадскай небяспекі злачынстваў.

6. Высвятленне сацыяльных карэнняў злачыннасці, паказ антысацыяльных рыс злачынцы і выкрыццё тых з'яў, якія прыводзяць чалавека да злачынства (у прыватнасці, паказ лагічнай сувязі паміж праступкам, правапарушэннем і злачынствам).

7. Знаёмства вучняў з высакароднай дзейнасцю органаў дзяржавы і грамадскіх арганізацый, што ахоўваюць сацыялістычную законнасць. Вывучэнне матэрыялаў аб патрыятычных дзеяннях савецкіх грамадзян, якія дапамагаюць органам правапарадку ў барацьбе са злачыннасцю.

Асаблівую ўвагу ў прававым выхаванні неабходна звяртаць на ўдасканаленне станоўчага вопыту дзяцей або на змяненне тых маральных і прававых пераканянняў, якія склаліся ў іх яшчэ ў дашкольным узросце пад неспрыяльным уплывам сям'і і навакольнага асяроддзя.

Вялікім маральна-прававым компасам падрастаючага пакалення павінна стаць новая Канстытуцыя СССР. Гуманістычны, высокамаральны аспект Асноўнага Закона — магутны сродак выхавання этычна-прававой культуры школьнікаў. У яго залатых літарах і чаканных фармулёўках скандэнсаваны самыя прагрэсіўныя прававыя ідэалы чалавецтва, палітычныя, этычныя і іншыя ідэі і прынцыпы, характэрныя для сацыялістычнага права і сацыялістычнай законнасці.

Не маючы магчымасці ўсебакова асвятліць усю сістэму прававога выхавання ў школе, аўтар робіць асноўны акцэнт на выхаваўчы бок выкладання прававых пытанняў і арганізацыі пазакласнай работы.

У кнізе даецца больш падрабязная распрацоўка тых урокаў, якія маюць асабліва вялікае значэнне ў фарміраванні правасвядомасці і грамадзянскай адказнасці вучняў, у выхаванні павагі да савецкіх законаў, да норм і правіл сацыялістычнага правапарадку.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мы разгледзелі некаторыя звенні адзінай сістэмы прававога выхавання вучняў, звяртаючы асаблівую ўвагу на фарміраванне ў іх павагі да права і савецкіх законаў. У гэтых законах скандэнсаваны асноўныя маральна-прававыя нормы, якія рэгулююць грамадскія адносіны людзей, накіроўваюць пры дапамозе юрыдычных правоў і абавязкаў іх дзейнасць. Ужо сам факт замацавання тых ці іншых этычных норм і патрабаванняў у законах і іншых прававых актах, якія выражаюць сацыяльна-палітычныя і маральныя прынцыпы сацыялістычнага грамадства і сацыялістычнай дэмакратыі, мае вялікае выхаваўчае значэнне.

Практыка фарміравання правасвядомасці вучняў дазваляе зрабіць некаторыя вывады.

Перш за ўсё прававое выхаванне ў школах, у тым ліку фарміраванне павагі да закона, нельга зводзіць да прававой адукацыі або толькі да выкладання «Асноў Савецкай дзяржавы і права». Яно павінна пранізваць усе

*бакі* выхаваўчай работы ў школе, пачынаючы з I класа, і ажыццяўляцца як у працэсе выкладання спецыяльнага курса права, так і на іншых уроках (грамадазнаўства, гісторыі, геаграфіі, літаратуры, этыкі), а таксама ў пазакласнай рабоце з вучнямі. Без гэтага нельга ўявіць сабе комплексны падыход да пастаноўкі ўсёй справы выхавання. Іменна таму *фарміраванне праваевядомасці вучняў павінна спалучацца з ідэйна-палітычным, працоўным і, галоўнае, з маральным выхаваннем, мець з імі адзіныя тактычныя мэты.*

Прававое выхаванне як пэўную сістэму не трэба зводзіць і да асобных эпізадычных «мерапрыемстваў». Яно павінна ажыццяўляцца сістэматычна, паслядоўна, пастаянна і планамерна, стаць кроўнай справай усіх педагогаў. Гэта, вядома, не выключае карыснасці сустрэч вучняў з юрыстамі. Аднак асноўныя намаганні неабходна накіраваць на «выхаванне выхавацеляў», на павышэнне прававой культуры саміх педагогаў. У многіх школах рэспублікі юрысты прыйшлі на дапамогу настаўнікам. Іх саюз становіцца ўсё больш трывалым і садзейнічае большай эфектыўнасці прававога выхавання вучняў.

Далей. Рашаючае значэнне ў павышэнні прававой культуры вучняў набывае сувязь прававой інфармацыі з фактамі іх штодзённага жыцця, прывучэння школьнікаў да *сацыяльнай ацэнкі сваіх учынкаў.* Калі прававое выхаванне вядзецца на прыкладах, якія не закранаюць штодзённае асяроддзе вучняў, узнікае небяспека, што падлеткі пачнуць паблажліва ставіцца да «дробных» парушэнняў закона з боку таварышаў. Даўно вядома: выхоўваюць не столькі словы і павучанні, колькі сацыяльная практыка, у дадзеным выпадку ўся маральна-прававая атмасфера вучнёўскага і настаўніцкага калектыву, а таксама сям'і.

З гэтага вынікае, што прававую інфармацыю, тлумачэнне тых ці іншых прававых норм неабходна спалучаць з разумнай патрабавальнасцю да канкрэтных па-

водзін вучняў. Прававая прапаганда «наогул», якая спалучаецца з цярпімасцю да канкрэтных фактаў прагулаў, грубасці, хуліганства, выпівак, парушэнняў на вачах у педагогаў «Правіл для вучняў» у грамадскіх месцах, не толькі траціць свой выхаваўчы эфект, але можа прывесці да процілеглых вынікаў. У вучняў, напрыклад, часам складваецца думка, быццам патрабаванне выконваць прававыя прадпісанні і законы — гэта «толькі размова», а ў жыцці ўсё інакш.

Калі ж такая думка і склалася ў свядомасці некаторых вучняў пад уплывам сяброў або сям'і, то ні ў якім разе нельга праходзіць міма рэплік, выказванняў падлеткаў і, яшчэ горш, забараняць іх. Лепш за ўсё даказаць самому падлетку і яго саўдзельнікам, што меркаванні тыпу «ўсе п'юць» або «ўсе ўладкоўваюцца як могуць» грунтуюцца на адзінкавых фактах. Пры гэтым важна на канкрэтных прыкладах паказаць свайму «апаненту», што канкрэтнае зло існуе толькі да таго часу, пакуль вакол яго пануе абыякавасць, усёдаравальнасць. Будзе добра, калі настаўнік раскажа, як пасты «камсамольскага пражэктара», народныя дружыны, камсамольскія аператыўныя атрады вядуць эфектыўнае наступленне на канкрэтных носьбітаў сацыяльнага зла.

У прававым выхаванні, як, зрэшты, у выхаванні наогул, не можа быць дробязей. Нельга недаацэньваць небяспекі такіх дзеянняў, як замоўчванне зробленых у школе крадзяжоў іншых правапарушэнняў, нанясенне цялесных пашкоджанняў і г. д. У гэтых выпадках на вачах школьнікаў падрываецца прынцып няўхільнасці справядлівага пакарання за кожнае правапарушэнне. На жаль, ў фарміраванні сярод вучняў скажоных прававых перакананняў часам уносіць свой «уклад» і педагог, які перад прыходам праверачнай камісіі на ўрок загадзя размяркоўвае ролі адказваючых. У выніку дзеці пачынаюць лічыць, што калі гэта «выгадна», то дазволены і няшчырыя паводзіны, а з цягам часу і прыпіскі, ска-

жэнні ў справаздачнасці. Дзесяткі лекцый і гутарак на прававыя тэмы часам не ў стане кампенсаваць шкоду, нанесеную адным дрэнным прыкладам выхавацеля.

Таму ў працэсе прававога выхавання неабходна ўдзяляць самую сур'ёзную ўвагу ўстараненню ўсіх наяўных недахопаў у правасвядомасці вучняў, сфарміраваных у іх пад неспрыяльным уплывам бліжэйшага бытавога акружэння, падлеткавага мікраасяроддзя і г. д. Нейтралізаваць уплыў адсталых поглядаў школьнікаў на права і савецкія законы, рашуча змагацца з крыніцамі гэтых поглядаў — адказная задача педагогаў.

Наступная праблема прававога выхавання вучняў — распрацоўка выразных крытэрыяў ацэнкі яго эфектыўнасці. Наўрад ці правільна, напрыклад, ацэньваць вынікі прававога выхавання, і тым больш прававой прапаганды, толькі па наяўнасці ці адсутнасці неадкладных змяненняў ва ўзроўні правапарушэнняў у школе. Гутарка ідзе аб працяглым працэсе, вынікі якога могуць выявіцца не так хутка. Апрача таго, на ўзровень правапарушэнняў, як і на іх рэгістрацыю, уплывае рад іншых фактараў. Вось чаму на першым этапе прававога выхавання мэтазгодна меркаваць аб яго эфектыўнасці не толькі па непасрэдных, але і ўскосных даных: яго сістэматычнасці, паўнаце ахопу вучняў і іх узроставых груп прававой прапагандай, грамадскай актыўнасці школьнікаў, іх практычнаму ўдзелу ў рабоце па падтрыманню правапарадку і ахове прыроды і г. д.

Павышэнне ўзроўню прававой свядомасці падрастаючага пакалення — важнейшая і неадкладная задача органаў народнай адукацыі, педагагічных калектываў школ, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Можна без перабольшання сказаць, што заўтрашняе становішча сацыялістычнай законнасці і прававая культура грамадзян Савецкага Саюза ў многім залежаць ад прававога выхавання, якое ажыццяўляецца ў сценах сённяшняй школы.

## ЗМЕСТ

Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . 3

*Раздзел першы.* **Улік узроставых і псіхалагічных асаблівасцей у прававым выхаванні вучняў** . . . . 8

§ 1. Асаблівасці прававога выхавання вучняў малодшага ўзросту . . . . . . . . . . . . . . . . —
§ 2. Фарміраванне правасвядомасці вучняў IV—VII класаў 16
§ 3. Пытанні прававога выхавання ў VIII—X класах . . . 24

*Раздзел другі.* **Курс «Асноў Савецкай дзяржавы і права» — важнейшае звяно ў сістэме прававога выхавання** . . . . . . . . . . . . . 31

§ 1. Выхаваўчае значэнне новага курса . . . . . . . —
§ 2. Узнікненне Савецкай дзяржавы і права . . . . . 37
§ 3. Сацыялістычнае права . . . . . . . . . . . 44
§ 4. Крымінальнае права . . . . . . . . . . . . 51
§ 5. Забеспячэнне законнасці і правапарадку . . . . . 54

*Раздзел трэці.* **Вывучэнне пытанняў савецкага права на ўроках грамадазнаўства** . . . . . . . . . 59

§ 1. Агульныя метадычныя заўвагі . . . . . . . . —
§ 2. Сацыялістычная законнасць . . . . . . . . . 67
§ 3. Асноўныя правы савецкіх грамадзян . . . . . . 72
§ 4. Асноўныя абавязкі савецкіх грамадзян. Адзінства правоў і абавязкаў . . . . . . . . . . . . . . 78

*Раздзел чацвёрты.* **Асноўныя формы і метады прававога выхавання вучняў на ўроках і ў пазакласнай рабоце** . . . . . . . . . . . 85

§ 1. Асноўныя паняцці . . . . . . . . . . . . —
§ 2. «Правілы для вучняў» і Статут школы — прававая аснова выхавання школьнікаў . . . . . . . . . . 89

§ 3. Прававая прапаганда на класных гадзінах . . . . 93
§ 4. Прававая прапаганда на палітінфармацыях . . . . 94
§ 5. Цыкл радыёперадач «Мне аб законе, закон аба мне» . 97
§ 6. Лекцыі юрыстаў . . . . . . . . . . . . 98
§ 7. Выступленні старшакласнікаў перад вучнямі іншых класаў . . . . . . . . . . . . . . . 103
§ 8. Прагляд кінафільмаў з наступным іх абмеркаваннем . 104
§ 9. Выкарыстанне тэлебачання ў прававой прапагандзе сярод вучняў . . . . . . . . . . . . . . 109
§ 10. Вечары пытанняў і адказаў на прававыя тэмы . . . 111
Заключэнне . . . . . . . . . . . . . . 115

*Эмануил Григорьевич Иоффе*

**Воспитывать уважение к закону**

Минск, издательство «Народная асвета»

На белорусском языке

Рэдактар І. І. Цукерман. Вокладка мастака Р. У. Кандрата. Мастацкі рэдактар А. Г. Інкін. Тэхнічны рэдактар В. Н. Жук. Карэктар С. С. Аніскевіч.

ІБ № 583

Здадзена ў набор 30.12.77. Падпісана ў друк 26.05.78. АТ 17141. Фармат 70×108¹/₃₂. Пап. друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Друк высокі. Ум. друк. арк. 5.25. Ул.-выд. арк. 5,2. Тыраж 11 000 экз. Заказ 714. Цана 15 к.

Выдавецтва «Народная асвета» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600 Мінск, Паркавая магістраль, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. 220041 Мінск, Ленінскі праспект, 79.